Каардынацыйны камітэт
«Гродзенская ініцыятыва»

# Беларуская нацыянальная ідэя

*Пад рэдакцыяй*
*А.А.Астроўскага, В.А.Санько*

Матэрыялы міжнароднай
навукова-практычнай канферэнцыі

*18—19 красавіка 1999 г., г. Гродна*

Мінск
Беларускае выдавецтва
Таварыства «Хата»

2000

Репозиторий БарГУ

УДК 316.42:338.2
ББК 65.011
Б 86

**Каардынацыйны камітэт «Гродзенская ініцыятыва»**

**Рэдакцыйная калегія:**
**Уладзімір Конан,** доктар філасофскіх навук, прафесар; **Дзімітрый Караў,** доктар гістарычных навук; **Алесь Астроўскі,** доктар медыцынскіх навук, прафесар

**Рэцэнзенты:** Лабараторыя рэгіянальнай літаратуры ГрДУ імя Янкі Купалы (А.Ф.Смалянчук); Беларускі нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францішка Скарыны

Б 86 **Беларуская нацыянальная ідэя.** Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 18—19.4.1999, г. Гродна. / Пад рэдакцыяй Алеся Астроўскага, Валера Санько. — Мн.: Бел. выд. Тав-ва «Хата», 2000. — 448 стар.

**ISBN 985-6007-78-X**

Нацыя — базавая ячэйка любой тэхналагічнай цывілізацыі. Нацыянальная пачуцці святыя ў любой дзяржаве. Як чалавек абавязаны выканаць наканаванае, так нацыя мусіць здзейсніць прадвызначанае і займець адведзенае ёй Богам месца ў касмічным сонме.

Не зробіць наканаванае чалавек — зарана ссячэ сябе, перанясе ўласную грахоўнасць і ляноту на крэўных, знішчыць іх; не адваюе вызначанае месца ў касмічнай і часавай прасторах нацыя, стане прыстасоўвацца да суседзяў і абставінаў — прападзе. Растворыцца соллю ў вадзе. Заслужыць ганьбаванне і нядобразычча ў першую чаргу ўласных сыноў і, ў другую, суседзяў.

Кожны з аўтараў прачытаных і дасланых артыкулаў якмогна выказваўся на адну тэму: беларуская нацыянальная ідэя жыла, жыве і вечна будзе жыць на беларускіх землях. Часам адна думка і вывад паўтараецца ў двух-трох аўтараў. Часам яны сходныя ў адмаўленні камуністычных ці сялянскіх ідэяў. Часам у жаданні справядлівіцца яны перабольшваюць у крытыцы былых і цяперашніх беларускіх уладальнікаў. Але яднае ўсіх адно: кожны аўтар могся прынесці ўласныя цагліны-думкі ў фундамент агульнага дома беларускай нацыянальнай ідэі. Кожны хоча дабра, моцы і незалежнасці радзімай зямлі, Маці-Беларусі.

Адначасова, пры ўсёй колкасці і каструбаватасці выступленняў, лёгка заўважыць, што ўсе аўтары засцерагаюць лідэраў дзяржавы і партыяў ад узвялічвання сябе, невыслухоўвання думкі апанентаў. Заклікаюць бараніць, як уласных дзяцей, айчынную зямлю, беларускія традыцыі, мову, волю.

Будучыя пакаленні не асудзяць выступоўцаў на канферэнцыі за смеласць выказванняў. Беларуская нацыянальная ідэя для беларусаў павінна стаць святой. Як святая для рускага — руская нацыянальная ідэя, для паляка — польская, англічаніна — англійская. А са святога, якой бы нацыі ці рэлігіі не належала, не пасміхаюцца. Тым болей не кпяць. Святое вывучаюць і аналізуюць. Спадзяёмся, такі лёс будзе і ў дадзенай кнігі.

Не збаімся перабольшвання, але пэўнімся: матэрыялы канферэнцыі з`яўляюцца сацыялагічным зрэзам думкаў беларускага грамадства канца XX ст. па гэтых пытаннях.

У асноўным захаваны стыль аўтараў. Значна скарочаны палемічныя выпады.

Для шырокага кола чытачоў.

**ISBN 985-6007-78-x**

**ББК 65.011**
**УДК 316.42:338.2**

© БВТ «Хата», 2000
© Гродзенскае абласное аб`яднанне «Ратуша», 2000

Репозиторий БарГУ

**Літаратура**
[1]Таранович В.П. Экспедиция академика И.И.Лепехина в Белоруссию и Лифляндию в 1773 г. // Архив истории науки и техники. — М.-Л.,1835. — Т.1.— Вып.1. — С. 545-568; Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или Минералогические хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 г. академиком В.Севергиным. — СПб., 1803, 1804; Продолжение записок
[2]Шапиро А.Л. Русская историография с древнейших времен до 1917 года. — М., 1993. — С. 293-318.
[3]Lelewel J. Nauki dajace poznawac zrodla historyczne. — Wilno, 1822.
[4]Караў Д.У. Каля вытокаў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, канец XVIII — 50-я гады XIX стагоддзя. — Гродна, 1993. — Кн 5.-Ч.II. — С.285.
[5]Устрялов Н.Г. Русская история. — СПб.,1837. — Т.1. — С.444.
[6]Тамсама. — С.445.
[7]Пичета В.И. Введение в русскую историю (Источники и историография). — М., 1923. — С.19.
[8]Устрялов Н.Г. Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское. — СПб., 1839.
[9]Турчинович О.В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. — СПб., 1857. — Ч.VII.

# Беларускі народ у творах гісторыкаў-заходнерусістаў

***Аляксандр Літвінскі***

Заходнерусізм — адзін з найбольш уплывовых кірункаў грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі Беларусі і Расіі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя. Выкліканы да жыцця ў першую чаргу падзеямі паўстання 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі, ён з самага пачатку набыў яскравыя рысы паланафобіі, таму што галоўнай мэтай дзеячаў гэтага кірунку якраз і была барацьба з ідэалогіяй, якой натхняліся паўстанцы, а таксама, шырэй, барацьба з самымі рознымі, у тым ліку, калі казаць пра землі былога ВКЛ, і «краёвымі» праявамі польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Гэтай мэты прадстаўнікі заходнерусізму імкнуліся дасягнуць разнастайнымі сродкамі. Бадай што найгалоўнейшым з іх быў актыўны ўдзел у навукова-гістарычных даследаваннях, на грунце якіх склалася цэлая гістарыяграфічная школа, у той час, асабліва ў 60-80 гг. XIX стагоддзя, вельмі ўплывовая. Яе безумоўны лідэр, ураджэнец польска-беларускага этнічнага памежжа М. В.Каяловіч зрабіў неблагую навуковую кар'еру, стаўшы прафесарам Пецярбургскай духоўнай Акадэміі. Яго аднадумцамі, вучнямі і паслядоўнікамі былі такія навукоўцы, як П.Д.Бранідаў, П.В.Бабкоўскі, П.М.Жуковіч і інш. Да таго ж, дзякуючы шырокамаштабнай падтрымцы з боку расійскіх уладаў, як цэнтральных, так і ў першую чаргу рэгіянальных (асабліва сумна вядомага М.М. Мураўёва), утварылася цэлая сістэма, якая праз органы друку, навучальныя ўстановы, навуковыя цэнтры прапагандавала погляды заходнерусістаў. Сярод такіх прапагандыстаў трэба назваць перш за ўсё К.А.Гаворскага і С.Л.Шаўковіча.

Вышэйзгаданы антыпаланізм гэтай плыні гістарычнай навукі вымагаў стварэння сваёй, адрознай ад польскай канцэпцыі гісторыі ВКЛ («Заходняй Расіі», па тэрміналогіі Каяловіча і яго паслядоўнікаў — адсюль і назва плыні). Якое ж месца ў навуковых пабудовах заходнерусістаў адводзілася беларускаму народу? З упэўненасцю можна сцвярджаць, што гісторыкі гэтага кірунку не бачылі ў беларускім народзе самастойнай, адрознай ад рускага народа існасці. Трацячы вельмі шмат сіл на абгрунтаванне тэзісу аб тым што «Заходняя Расія»— гэта ні ў якім разе не польскі край, яны ў той жа час не надавалі вялікага значэння фактам адрознення беларусаў і вялікарусаў, таму што для большасці з іх (за выключэннем



Рэпазітарый БарДУ

хіба што П.В.Бaброўскага) адзінства «трох галін рускага племені» (у дадатак яшчэ і ўкраінцаў) вызначалася агульнасцю іх славянскага паходжання і асабліва прыналежнасцю насельніцтва як Расіі («Усходняй Расіі», згодна з іх тэрміналогіяй), так і Украіны ды Беларусі да адзінавыратавальнай, з іх пункту гледжання, праваслаўнай рэлігіі. Уласцівыя беларусам моўныя, культурныя, побытавыя рысы, якія аддзялялі іх ад вялікаросаў, не мелі, на думку большасці прадстаўнікоў гэтай гістарыяграфічнай плыні, этнавызначальнага значэння.

Увогуле, у творах гэтых гісторыкаў можна заўважыць пэўную неакрэсленасць у адносінах да тлумачэння тэрміна «беларускі народ». На гэта, акрамя ўсяго іншага, існавалі і аб'ектыўныя прычыны — у першую чаргу нераспрацаванасць навукова-метадычнага апарату, асабліва тэрміналогіі маладой тады яшчэ этнаграфічнай (этналагічнай) навукі і звязаная з гэтым перавага эмпірычных даследаванняў перад тэарэтычным абагульненнем. Таму ў навуковых працах другой паловы XIX стагоддзя назіраецца некаторая блытаніна ў такіх «апорных» словах, як «мова», «дыялект» («наречие»), «народ», «народнасць», «нацыя», «племя» і г.д. І калі заходнерусісты ўжывалі тэрмін «беларускі народ», то гэта для іх часта з'яўлялася тоесным выразу «беларускае племя», што для сучасных даследчыкаў, зразумела, зусім не тое самае.

Трэба сказаць, што пазіцыя М.В.Каяловіча ў пытанні, якое насельніцтва адносіцца да беларускага народа, была супярэчлівай. З аднаго боку, ён быццам згаджаўся, што не можна вызначаць этнічную прыналежнасць, зыходзячы толькі з канфесійнага фактару. Напрыклад, ён заяўляў, што Беларусь (канешне ж, у «заходнерускім» разуменні) — краіна, «дзе народ размаўляе па-беларуску»[1]. Аднак ён фактычна супярэчыў сам сабе, сцвярджаючы, што канфесійны фактар нібыта «найлепшы» для размежавання палякаў і беларусаў і «што пройдзе... стагоддзе, калі можна будзе ўзяцца за які-небудзь жывы бок Заходне-Рускага жыцця, акрамя веры»[2]. Іншую пазіцыю займаў другі відны гісторык заходнерусісцкага кірунку П.В.Бaброўскі. Па-першае, ён у даволі катэгарычнай форме не згаджаўся лічыць прынцып веравызнання ў якасці асноўнага прынцыпу этнічнага падзелу паміж беларусамі і палякамі. Па-другое, ён вылучыў фактар мовы паўсядзённых зносін (не «царкоўнай» і не «касцельнай»!) у якасці галоўнага для вызначэння этнічнай прыналежнасці жыхароў Беларусі. Па-трэцяе, навуковец звярнуў увагу на важнасць традыцыйнай культуры, перш за ўсё фальклору, для вызначэння прыналежнасці да таго ці іншага этнасу. Ён рашуча адстойваў тэзіс аб адзінстве традыцыйнай культуры і ў праваслаўных беларусаў, і ў беларусаў-католікаў. Па-чацвёртае, ён прызнаваў адзінства і своеасаблівасць «маральнай філасофіі» беларусаў (найлепшы, хаця і не ў поўнай меры адэкватны адпаведнік гэтаму выразу Бaброўскага ў сучаснай нам тэрміналогіі — нацыянальны характар або менталітэт). У рэшце рэшт, навуковец паставіў пад вялікае сумненне абавязковую неабходнасць наяўнасці адзінай і агульнапрынятай саманазвы (аўтаэтноніма) для этнічнай ідэнтыфікацыі, бо аб'ектыўны змест этнаўтваральных адзінак (мовы, фальклору, звычаяў і г.д.) важнейшы за суб'ектыўнае самавызначэнне індывіда[3].

І ўсё ж П.В.Бaброўскі не прыйшоў да вываду аб існаванні самастойнага, асобнага ад рускага беларускага народа-этнасу. Ён, хаця і заклаў асновы тэорыі і метадалогіі навуковых даследаванняў беларусаў, не змог, як і яго аднадумцы, адказаць на пытанне, як сумясціць прызнанне этнаграфічнай самабытнасці насельніцтва Беларусі з праблемай існавання асобнага беларускага этнасу. Для яго, як і для іншых прадстаўнікоў аналізуемай плыні гістарычнай навукі, беларусы, пры ўсёй сваёй адметнасці, заставаліся «заходнімі рускімі». Мала таго, астатнія заходнерусісты лічылі якраз канфесійны фактар галоўным, фактычна неабходным і дастатковым для ўключэння праваслаўных беларусаў у склад рускага этнасу. Яны прыклалі шмат намаганняў для замацавання ў масавай свядомасці стэрэатыпу: «раз праваслаўны — то рускі, раз католік — дык паляк». Няма патрэбы спецыяльна даказваць шкоднасць стэрэатыпу для працэсу фармавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Але ж гісторыкі разгляданай школы ўсё роўна мусілі неяк тлумачыць факт рэальных адрозненняў беларусаў ад рускіх. А гэтыя адрозненні кідаліся ў вочы кожнаму, хто вывучаў розныя бакі побыту беларусаў. Лягчэй за ўсё было б абвясціць гэты край польскім, зыходзячы з непадзельнага панавання ў ім да 60-х гг. XIX стагоддзя польскай культуры (маецца на ўвазе сфера адукацыі, навукі, мастацкай літаратуры або так званая культурная пабудова). Беларусы ў такім



Рэпазіторый БарДУ

выпадку рэпрэзентаваліся як усходняя галіна польскага народа. Трэба сказаць, што такі, безумоўна памылковы, погляд калі і не падтрымліваўся, дык і не сустракаў супраціўлення ў расійскім грамадстве першай паловы XIX стагоддзя. «Нават рускія навукоўцы той эпохі (пачатку XIX ст. — А.Л.) мелі... надзвычай смутныя ўяўленні аб гістарычным становішчы і ўласцівасцях заходняга краю»[4], — зазначыў з гэтай нагоды адзін з прадстаўнікоў заходнерусісцкай гістарыяграфіі П.М.Жуковіч. Зразумела, заходнерусісты з вялікім імпэтам пачалі даказваць, што край гэты не ёсць польскі і не быў ім ніколі. Усе яны дружна адзначылі губнасць польскага ўплыву на Беларусь, і некаторыя з іх імкнуліся насадзіць вялікарускі вобраз жыцця, не зважаючы ні на якія мясцовыя асаблівасці. Асабліва «праславіўся» ў гэтым сэнсе К.А.Гаворскі[5]. Іншыя, як М.В.Каяловіч, займалі больш памяркоўную пазіцыю.

Незалежна ад таго, станоўча ці адмоўна гісторыкі-заходнерусісты ставіліся да этнічнай своеасаблівасці беларусаў, прычыны апошняй яны шукалі ў гістарычным мінулым Беларусі.

Праўда, М.В.Каяловіч аддаў пэўную даніну геаграфічнаму дэтэрмінізму, паколькі прычыну «малаініцыятыўнасці» беларусаў у параўнанні з украінцамі-«маларосамі» ён бачыў у беднасці і ўбогасці беларускай прыроды6. Аднак усё ж галоўная прычына няшчасцяў беларусаў у ходзе гісторыі заключалася, паводле Каяловіча, ва ўплыве на гэтыя землі «польскай, езуіцкай», «вельмі дрэннай цывілізацыі»[7]. Падзяляючы асноўны пастулат славянафільства аб безумоўнай перавазе праваслаўя над каталіцызмам, ён і яго аднадумцы не шкадавалі чорнай фарбы для напісання карціны заняпаду «Заходняй Расіі» ў выніку пранікнення сюды «духу лацінства»[8]. Беларускі народ паказваўся заходнерусістамі як аб'ект польска-каталіцкай экспансіі і адначасова як яго праціўнік. Аднак бясплённымі былі б спробы знайсці ў гэтых творах такі падыход да гісторыі беларускага народа, пры якім ён разглядаўся б як супольнасць сацыяльных груп з уласцівымі ім асобнымі інтарэсамі і сістэмай каштоўнасцяў. Амаль заўсёды ў працах Каяловіча і яго прыхільнікаў ён выступае як нейкае цэлае, знітаванае адзінай праваслаўнай верай, як народ «увогуле». З усіх формаў грамадскай актыўнасці навукоўцаў гэтай школы цікавіць толькі актыўнасць, накіраваная на абарону праваслаўнай веры ад каталіцкага націску. Вось чаму гісторыя ВКЛ да эпохі Люблінскай 1569 г. і Берасцейскай царкоўнай 1596 г. уній раскрываецца імі праз апісанне дзейнасці князёў-уладатрымальнікаў.

Адзін П.Дз.Бранцаў дае разгорнутую ацэнку беларускага народа ў «далюблінскі» перыяд. Ён пісаў: «Як беларускі і маларускі народ, падобна да ўсіх славянскіх народаў, вылучаўся непастаянствам, няцвёрдасцю ў перакананнях і палітычнай нетактоўнасцю (? — А.Л.), так, наадварот, вялікарускі народ вылучаўся і вылучаецца пастаянствам і цвёрдасцю ў перакананнях і палітычным тактам, як беларусы і маларосы дзейнічалі ў большасці выпадкаў пад уплывам хвіліны, імпэту, без сістэмы, урыўкамі, так, наадварот, вялікарускі народ дзейнічаў і дзейнічае сістэматычна, з разлікам і халодным розумам. Як беларускі, так і маларускі народ, падобна да ўсіх славян, бачыў палітычны ідэал у свабодзе, незалежнасці, у непадпарадкаванні колькі-небудзь выдатнаму аўтарытэту, у дэцэнтралізацыі, так, наадварот, вялікарускі народ бачыў і цяпер бачыць свой палітычны ідэал у падпарадкаванні адзін аднаму, у цэнтралізацыі і прызнанні вышэйшага аўтарытэту, найвышэйшай абсалютнай манархічнай улады, якую ён прызнае ў якасці сакральнай і недатыкальнай»[9].

Можна заўважыць, ацэнка носіць спекуляцыйны характар, з тэксту працы Бранцава немагчыма зразумець, якія фактары беларускай, украінскай і расійскай гісторыі паслужылі гісторыку крыніцамі для такіх высноваў. Калі пагадзіцца з ім, што тыя рысы нацыянальнага характару, якія ён прыпісвае беларусам і ўкраінцам, з'яўляюцца генетычна славянскімі, то, ізноў-такі, незразумела, чаму яны зніклі ў рускага народа. Цікава пры гэтым адзначыць, што, у адрозненне ад большасці навукоўцаў славянафільскай арыентацыі, П.Д.Бранцаў не лічыць вялікаросаў своеасаблівым эталонам славянства, што, аднак, не перашкаджае яму выказвацца пра іх у апалагетычным тоне[10].

Большую цікавасць да фактаў народнай актыўнасці беларусаў у гісторыі гісторыкі-заходнерусісты праяўляюць, калі гаворка заходзіць пра падзеі, звязаныя з заключэннем царкоўнай уніі 1596 г. і з далейшым распаўсюджаннем уніяцтва. Яны рашуча адмаўляюцца бачыць у ім хоць які-небудзь станоўчы сэнс. Трэба пры гэтым адзначыць, што яны прызнавалі існаванне крызісу праваслаўнай царквы ВКЛ у

Рэпазіторый БарДУ

якасці адной з найважнейшых перадумоў уніі. На думку П.М.Жуковіча, хаця унія і была «справай пераважна польскай дзяржаўнай палітыкі і агульнай рымска-каталіцкай рэакцыі»[11], усё ж «гэтая палітыка і гэтая рэакцыя»[12] займелі спрыяльную глебу ў тагачасным грамадстве дзякуючы несамавітаму становішчу праваслаўя, што і прывяло да вышэйзгаданага крызісу, які заключаўся «ў крайнім заняпадзе ў той час заходнерускай праваслаўнай царквы, а таксама ў антаганізме з ёй найвышэйшай царкоўнай іерархіі і парафіян, якія канцэнтраваліся ў царкоўных брацтвах»[13]. Гэты антаганізм раскрываўся ў творах заходнерусістаў усебакова, і сімпатыі іх былі, канешне ж, на баку брацтваў. Усяляк падкрэсліваўся вузкаіерархічны, а значыць, і антынародны характар уніі. Характарызуючы раскол, які адбыўся на Берасцейскім саборы 1596 г. паміж прыхільнікамі і праціўнікамі уніі, Жуковіч сцвярджаў, што там сутыкнуліся два юрыдычныя падыходы да уніі: калі епіскапат адстойваў прынцып, згодна з якім парафіяне павінны падпарадкоўвацца любым яго рашэнням, то парафіяне з гэтым не згаджаліся і не хацелі ісці за епіскапатам у справе «здрады праваслаўю»[14].

Барацьба беларускага (як і ўкраінскага) народа супраць уніі паказваецца ў творах М.В.Каяловіча як паступовае адступленне абаронцаў праваслаўя пад націскам пераўзыходных сіл каталіцызму, якія карысталіся падтрымкай уладаў Рэчы Паспалітай. Услед за «адступніцтвам» найвышэйшага духавенства прыйшла чарга і «заходнебеларускай арыстакратыі», у выніку чаго справа барацьбы супраць «лацінства» — «народная, заходнеруская справа перайшла пад абарону сярэдняга стану — гарадскога, мяшчанскага і яшчэ больш, чым у арыстакратыі, сканцэнтравалася ў пытанні аб веры»[15]. Мяшчанства, з пункту погляду навукоўца, магло выконваць некаторы час гэтую функцыю, таму што ў выніку адноснай слабасці гарадскога жыцця ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы ў гарадах не было яшчэ, на момант заключэння уніі, моцнага наплыву іншаземцаў, які мог бы падарваць яго маральныя асновы[16]. Другой прычынай стала Магдэбургскае права, па якім «кіраванне гарадамі ў руках саміх грамадзян»[17], і якое стымулявала іх энергічнасць, ініцыятыўнасць.

На пярэднім краі слаўныя брацтвы, дзейнасцю якіх Каяловіч захапляўся і нават прапанаваў іх адрадзіць ва ўмовах XIX ст. Аднак і «гарадскі» этап змагання супраць уніі закончыўся няўдачай. Цікава, што гісторык лічыць адным з фактаў спрыяння уніяцтву забойства полацкага уніяцкага архіепіскапа І.Кунцэвіча ў выніку шырокавядомых падзей 1621 г. у Віцебску, бо яно (дакладней, расправа з паўстанцамі — віцебскімі мяшчанамі, учыненая ўладамі Рэчы Паспалітай) паказала бясплённасць змагання за чысціню праваслаўя і ў дадатак стварыла так неабходны для прапаганды царкоўнага аб'яднання вобраз пакутніка за веру[18]. Да гонару прафесара ПДА, ён, хоць паказвае Кунцэвіча ў якасці антыгероя беларускай гісторыі і цалкам прызнае справядлівасць віцебскага паўстання, усё ж называе яго забойства «гнюснай справай»[19]. Увогуле, заходнерусісты ў цэлым былі супраць гвалтоўных формаў палітычнай барацьбы і асуджалі іх праявы.

Падводзячы вынік разгляду працэсу распаўсюджання уніяцтва, М.В.Каяловіч са скрухай канстатаваў яго перамогу, адзначаючы, што «ўсе літоўска-рускія вобласці польскага каралеўства выпрабавалі на сабе яе (уніі. — А.Л.) удары і праваслаўныя ўсюды былі прыгнечаныя настолькі, што самі сваімі ўласнымі сродкамі не маглі ўжо стварыць ёй сур'ёзныя цяжкасці»[20]. Пры гэтым і сама унія «... для сябе, уласна — выпрацавала няшмат, але вельмі шмат для лацінства»[21]. Такім чынам, Каяловіч не прызнаваў за уніяцтвам самастойнай існасці. Пры такім падыходзе не магло нават і ставіцца пытанне аб ролі уніяцкай царквы ў захаванні этнакультурнай спадчыны беларусаў, паколькі, згодна з Каяловічам, гэта не мела аніякага значэння, раз само уніяцтва з'яўлялася адступленнем ад чысціні праваслаўя, а значыць, усё звязанае з канфесіяй 1596 г., безумоўна, заганае — дзе ўжо тут было весці размову аб нейкіх станоўчых момантах.

Як ужо сказана, усе беды беларускага народа гісторыкі-заходнерусісты звязвалі з пераможным шэсцем па яго зямлі польскага варыянту каталіцызму. Гэтая канцэптуальная выснова распаўсюджвалася, між іншым, і на сферу сацыяльных дачыненняў. Так, М.В.Каяловіч пісаў: «Паны былі католікамі, хлоп — рускі або ліцвін. Усё рускае і літоўскае рабілася нізкім, ганебным. Выпрацоўвалася нацыянальнае хлопства»[22]. І яшчэ: «Цяжкі ўвогуле пан для хлопа, але непараўнальна больш цяжкі



Рэпазіторый БарДУ

польскі пан для рускага (і, канешне, літоўскага) хлопа; і яшчэ больш цяжкі лацінскі польскі пан для рускага праваслаўнага ці нават уніяцкага хлопа, — тут дадаецца рэлігійнае хлопства»[23]. Пытанне, якім чынам растлумачыць узнікненне і развіццё прыгоннага права ў Расіі, якая як быццам не зазнала ні польска-каталіцкага ўплыву, ні уніяцтва, Каяловіч дыпламатычна абыходзіць. Затое безапеляцыйна (і бяздоказна) заяўляе, што «польскае хлопства — бясспрэчна горшы стан, чым прыгонная залежнасць ад Расіі»[24]. Намаляваўшы гэткую бязрадасную карціну поўнага заняпаду беларускага народа ў складзе Рэчы Паспалітай, ён робіць дзве ўзаемазвязаныя высновы: па-першае, «як ні пакутаваў тут (у Беларусі. — А.Л.) народ ад польскіх шаленстваў, але не мог нічога зрабіць. Яго раскіданасць, пры мностве панаў, аніяк не дазваляла яму супрацьпаставіць сваю сілу»[25]; па-другое (гэта па-свойму лагічна вынікае з першай высновы), «народ... патрабаваў далучэння да праваслаўя»[26], што ва ўмовах XVIII стагоддзя азначала далучэнне да Расіі, якое, як няцяжка здагадацца, гісторыкі-заходнерусісты лічылі пераломнай і, канешне ж, станоўчай падзеяй у гісторыі беларускага народа.

Нават у масавай раздачы беларускіх земляў з прыгоннымі сялянамі М.В.Каяловіч бачыў дадатную з'яву. «Вядома, што Кацярына раздавала саноўнікам маёнткі ў нованабытых землях. Стаўшы праз гэта блізка да народа, угледзеўшыся ў яго сапраўднае становішча, гэтыя саноўнікі нярэдка рабіліся зусім іншымі людзьмі, — з сяброў і апекуноў палякаў і лацінаў ператвараліся ў раўнівых прыхільнікаў праваслаўя...»[27], з задавальненнем адзначаў лідар заходнерусістаў. Ці бліжэй пры гэтым станавіліся беларускія сяляне да сваіх гаспадароў, яго не цікавіла. Фактычна салідарызуецца са сваім настаўнікам і П.М.Жуковіч, калі заяўляе, што «...пасля шматвяковых намаганняў і ахвяраў народнай працы дзяржава наша (Расійская. — А. Л.) вырашыла, нарэшце, адну з асноўных задач — аб'яднала тры галоўныя галіны рускага народа. Тэрытарыяльныя набыткі імператрыцы Кацярыны былі рускімі этнаграфічнымі набыткамі — у існасці»[28]. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што Жуковіч прызнаваў факт пагаршэння становішча сялян, якія апынуліся ў складзе Расіі: «быў дазволены продаж сялян без зямлі»[29]. Аднак не гэты факт з'яўляўся для гісторыі вызначальным, бо хаця раздачы зямлі не мелі, на яго думку, мэтай «абрусення краю»[30], але ж яны вялі нібыта да росту ў асноўнай масе беларускага насельніцтва рускай самасвядомасці і спрыялі пераходу уніятаў у праваслаўе[31]. Самыя ж падзеі, што прывялі да скасавання ў 1839 г. на беларускіх землях уніі, падзеі вельмі складаныя і ў любым выпадку неадназначныя, атрымалі ў заходнерусісцкай гістарыяграфіі апалагетычную ацэнку. «Уз'яднанне уніятаў 1839 г. — было падзеяй найвялікшай важнасці ў жыцці паўночна-заходняга краю, якая не мела сабе роўных на ўсім працягу папярэдняй яго гісторыі пад рускай уладаю. З рускага пункту погляду, яна тым у асаблівасці была важная, што проста і рашуча вылучыла на першы план заходнерускі народ. Да гэтага часу польская інтэлігенцыя засланяла сабою, у вачах рускага грамадства і ўрада, яго рускую народную масу, і апошняя, пад абалонкай уніі ўяўлялася чымсьці больш блізкім да Польшчы, чым да Расіі»[32], — пісаў Жуковіч і нават параўноўваў ліквідацыю уніі з адменай прыгоннага права[33]. Згаджаўся з ім і П.В.Бабpоўскі. Характарызуючы не толькі ўсю палітыку Мікалая I у гэтай галіне, ён сцвярджаў, што ў выніку такой палітыкі «туземнаму народанасельніцтву Заходняй Расіі дадзены былі спосабы і сродкі да абароны яго першабытных скарбаў — мовы і веравызнання, якія суседняя Польшча старалася падмяніць сваімі, легкадумна і груба замахваючыся на найсвяцейшыя праявы рускага народа — а гэты народ у XIX стагоддзі складалі сяляне і белае грэка-уніяцкае духавенства»[34]. Як бачым, напісана так, каб у расійскага чытача склалася ўражанне, што большая частка насельніцтва Беларусі — адвеку руская — размаўляе на рускай мове, што яшчэ раз падкрэслівае факт прызнання заходнерусістамі (нават ліберальнага кірунку, як П.В.Бабpоўскі) беларускага народа толькі ў якасці часткі народа рускага — часткі, хаця не пазбаўленай пэўнай самабытнасці, але ўсё ж не самастойнай.

Аднак аналіз сітуацыі, што склалася на Беларусі да сярэдзіны XIX стагоддзя, паказвае, што сама па сабе ліквідацыя уніі не прывяла да каардынальных зменаў у этнакультурным становішчы. Па-ранейшаму панавала польская культура, а беларускае сялянства, няхай сабе ў большай сваёй масе ўжо фармальна праваслаўнае, заставалася гэткім жа бяспраўным, як і раней. Таму яшчэ большыя спадзяванні на



Рэпазіторый БарДУ

актывізацыю «народнага жыцця», якую прадстаўнікі разгляданай плыні гістарычнай навукі звязвалі з далейшай русіфікацыяй, яны ўсклалі на перыяд пасля задушэння паўстання 1863-64 гг. Трактоўка гэтага паўстання ў іх досыць простая: гэта быў, у разуменні, шляхецкі бунт, які адной з мэтаў, між іншым, прадугледжваў адабранне ў беларускага сялянства той волі, якая яму дадзена маніфестам Аляксандра II ад 19 лютага 1861 г. Не абцяжарваючы сябе доказамі, гэтую думку заходнерусісты адстойвалі ў многіх творах той эпохі. З непрыхаванай радасцю яны адзначалі, што народ не пайшоў за паўстанцамі. «Але ні газеты, ні заклікі, ні брашуры з плакатамі, нішто не паўздзейнічала на сялян: сяляне не прысталі да жонда (паўстанцкага. — А. Л.) і не пайшлі ў рокаш»[35], — сцвярджаў Бранцаў і дадае: «Нават і просты народ, адчуўшы сілу, сам стаў клапаціцца аб умацаванні праваслаўна-рускіх пачаткаў і, перш за ўсё, выявіў гэта ў садзейнічанні ўладкаванню праваслаўных цэркваў... Самыя каталікі... цэлымі парафіямі пачалі пераходзіць у праваслаўе, прычым касцёлы ператвараліся ў праваслаўныя цэрквы. Словам, руская справа і праваслаўе бачна ажылі, у краі ўсюды стала распаўсюджвацца перакананне, што край, адвеку рускі і праваслаўны, толькі няправільна захоплены каталікамі і імі гвалтоўна злацінізаваны. Думка аб адраджэнні ўсяго рускага стала ўсеагульнаю, — палякі і яўрэі сталі масамі пераходзіць ва ўрадавыя школы і вывучаць рускую мову»[36]. Намаляваная Бранцавым карціна, «па-заходнерускy» ідылічная, была вельмі далёкая ад рэальнасці, прасякнутая непакоем за будучыню «заходнерускай справы». Як адзначаюць даследчыкі самай рознай арыентацыі, царызм неўзабаве (пад канец 60-х гг. XIX ст.) узяў курс на прымірэнне з паланізаванай шляхтаю, што стварала небяспеку для ўкаранення рускіх пачаткаў у беларускім народзе. Каяловіч меў надзею на перараджэнне шляхты ў рускім духу: «Мы сапраўды ад усёй душы жадалі б, каб палякі Заходняй Pacii зрабіліся і рускімі, і праваслаўнымі, каб яны... успомнілі, што не заўсёды былі палякамі і лацінянамі, і што ў тыя часы, калі яны не былі ні палякамі, ні лацінянамі, яны часта блізка стаялі да народа і выпрацоўвалі шмат добротаў народных»[37]. Агульная выснова Каяловіча наконт будучыні беларускага народа гучала рашуча і нават ваяўніча: «Выратаваць Рускі і Літоўскі народ Заходняй Pacii ад Польскай шляхты і яўрэяў і апраўдаць сваё гістарычнае пакліканне перад славянамі — вось руская задачы ў Заходняй Pacii»[38]. Зазначым, што непрыхільнае стаўленне гісторыка да яўрэяў тлумачылася наяўнай у той час іх перавагай у гандлёва-рамеснай сферы, якую ён трактаваў як засілле, што перашкаджае развіццю «заходнерускага» народа.

Былі ў М.В.Каяловіча, так бы мовіць, «глабальныя» планы наконт лёсу беларусаў. Ён іх звязваў з рэалізацыяй так званай славянскай ідэі, якую разумеў, нягледзячы на некаторыя агаворкі ў ліберальным духу, як фактычна панславянскую, якая прадугледжвала б аб'яднанне славян (хутчэй за ўсё духоўнае, а не дзяржаўнае) пад апякунствам Pacii[39].

Калі разглядаць гістарыяграфічную дзейнасць прадстаўнікоў заходнерусізму і першнаперш, яго лідара М.В.Каяловіча, то, зыходзячы з вышэйсказанага, трэба адзначыць яе безумоўную варожасць беларускай нацыянальнай ідэі. Апошняя, па вялікім рахунку, фактычна зводзіцца да пастулата аб існаванні самастойнага беларускага этнасу (але ні ў якім разе толькі як часткі рускага або польскага). Права на этнічную незалежнасць і самадастатковасць беларусам прыходзілася даказваць у барацьбе з усімі, хто адмаўляў за імі такое права. Сярод апошніх бадай што на першым месцы знаходзіліся заходнерусісты. Разгляд іх гістарычных твораў толькі пацвярджае выснову, зробленую А.Цвікевічам аб тым, што заходнерусізм — гэта «плынь у гісторыі грамадскай думкі на Беларусі, якая лічыла, што Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з'яўляецца культурнай і дзяржаўнай часткай Pacii і таму павінна быць разглядана як адзін з яе састаўных элементаў»[40]. Такім чынам, заходнерусізм павінны разглядацца як своеасаблівы негатыў беларускай нацыянальнай ідэі, ідэалогія, якая вызнае практычную адмову рэалізацыі гэтай ідэі на карысць агульнарускай.

Рэпазіторый БарДУ

**Літаратура**

1. Коялович М. О. О расселении племён Западнорусского края России // Сборник статей, разъясняющих польское дело по отношении к Западной России.— Вып. 1. Сост. и изд. С.В.Шолкович. — Вильно, 1885. — С. 150. Заўвага: Тут і далей пры цытаванні твораў гісторыкаў-заходнерусістаў пераклад з рускай мовы на беларускую зроблены аўтарам.
2. Тамсама. — С. 144.
3. Бобровский П.О. Можно ли одно вероисповедание принять в основание племенного разграничения славян Западной России? // Русский ивалид. — 1864. — N 75, 80.
4. Жукович П.Н. О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России. — СПб., 1895. — С. 17 і наст.
5. Цвікевіч А. Западнорусизм. — Мн., 1993. — С. 17-104.
6. Коялович М.О. Лекции по истории Западной России. — М., 1864. — С. 26, 43.
7. Тамсама. — С. 43.
8. Коялович М.О. Литовская церковная уния. — СПб., 1861. — Т. 2. — С. 54.
9. Брянцев П.Д. История Литовского государства с древнейших времен. — Вильно, 1889. — С. 119-120.
10. Тамсама. — С. 120-122.
11. Жукович П.Н. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией.— Вып. 1. — СПб., 1901. — С. 386.
12. Тамсама.
13. Тамсама.
14. Тамсама. — С. 218-221.
15. Коялович М.О. Лекции по истории Западной России. — М., 1864. — С. 262-263.
16. Тамсама. — С. 212.
17. Тамсама. — С. 212-213.
18. Коялович М.О. Литовская церковная уния. — СПб., 1861. — Т. 2. — С. 54.
19. Тамсама. — С. 132.
20. Тамсама. — С. 237.
21. Тамсама. — С. 239.
22. Коялович М.О. Лекции по истории Западной России. — М., 1864. — С. 219.
23. Коялович М.О. О расселении племён Западного края России // Сборник статей... — Вып. 1. — С. 144.
24. Коялович М.О. Лекции по истории Западной России. — М., 1864. — С. 369.
25. Тамсама. — С. 337.
26. Там сама. — С. 363.
27. Коялович М.О. История воссоединения западнорусских униятств старых времен. — СПб., 1873. — С. 132.
28. Жукович П.Н. О русском землевладении... — С. 3.
29. Тамсама. — С. 4.
30. Тамсама. — С. 11.
31. Тамсама. — С. 14.
32. Тамсама. — С. 20.
33. Тамсама. — С. 31.
34. Бобровский П.О. Русская греко-униятская церковь в царствование императора Александра I. — СПб., 1890. — С. 304.
35. Брянцев П.Д. Польский мятеж 1863 г. — Вильно, 1892. — С. 63.
36. Тамсама. — С. 238-239.
37. Коялович М.О. Верноподданничество поляков Западной России // Сборник статей...— Вып. 2. — Вильно, 1887. — С. 361.
38. Ён жа. Лекции... — С. 393.
39. Ён жа. Грюнвальдская битва 1410 г. — СПб., 1885. — С. 18.
40. Цвікевіч А. Ук. твор. — С. 7.

Репозиторий БарГУ